bipart
Belarusian Institute for Public Administration Reform and Transformation
The art of public administration

PUBLIC ADMINISTRATION NEWS DIGEST **№ 103, 2026**

## Public Administration in Belarus: July - August 2026

This digest provides an overview of key developments in Belarusian public administration during July and August 2026. The period was marked by:

- Reshuffles within the security and military institutions
- The growing role of the Security Council in overseeing and coordinating security bodies
- The appointment of new Government ministers
- Personnel changes in local authorities

## Дзяржаўнае кіраванне ў Беларусі ў ліпені–жніўні 2026 г.

Новы выпуск дайджэста змяшчае агляд ключавых падзей у дзяржаўным кіраванні Беларусі ў ліпені–жніўні 2026 года. Галоўныя падзеі ў гэты перыяд уключалі:

- перастаноўкі ў сілавых і ваенных структурах;
- узрастаючую ролю Сакратарыята Савета Бяспекі і яго кіраўніка ў кантролі і каардынацыі дзейнасці КДБ і іншых сілавых структур;
- прызначэнні новых міністраў;
- кадравыя змены ў мясцовых органах улады.

### BIPART News / Навіны BIPART




Read our new research - ["Artificial Intelligence in Public Administration in Belarus: Opportunities and Risks in an

[Authoritarian Context"]

Наша новае даследаванне - "Штучны інтэлект у дзяржаўным кіраванні Беларусі: Магчымасці і рызыкі ва ўмовах аўтарытарызму"

## Public administration news




# Reshuffling in security forces and military

Following signals that a reshuffle was imminent, July and August saw a series of new appointments in Belarus's security bloc, including in the military. The changes affected the Belarusian Interpol bureau, the Investigative Committee, the KGB, the Defence Ministry, and the Armed Forces. While the appointments have been covered by independent and state media, publicly available information on staffing changes remains limited. This makes it difficult to assess whether the appointments reflect routine rotation, efforts to reinforce political loyalty, or other considerations.

Nevertheless, the concentration of new senior level appointments in several security and defence institutions in such a short period of time is notable. It suggests a broader process of staff renewal within the 'siloviki'.

### Reshuffles at the Investigative Committee

On 6 July, Siarhei Udovikau was dismissed as head of the Investigative Committee's Minsk Region Department. He was later appointed to a position of Deputy Prosecutor General. Udovikau, the former head of the Investigative Committee's Homiel region department, is notable for rejecting a criminal investigation into the death of the 2020 protest detainee Aliaksandr Vikhor. Udovikau's transfer follows a trajectory similar to that of the current Prosecutor General Dzmitry Hara, who was reassigned from heading the Investigative Committee in December 2025.

On 6 August, Aliaksandr Lukashenka reshuffled the heads of the Investigative Committee's regional departments. Major-General of Justice Uladzimir Shyshko was promoted from head of the Mahilyou regional office to head of the Minsk region, replacing Siarhei Udovikau. Shyshko oversaw politically-motivated cases against the Coordination Council, cases involving the financing of "extremist formations", and dozens of prosecutions for online

comments following the Andrei Zeltsar shooting.

Colonel of Justice Aliaksandr Pratasavitski replaced Shyshko as head of the Mahilyou regional office. Pratasavitski previously worked as deputy head of the Investigative Committee's directorate in the Minsk region, where he headed investigations of historical crimes and was responsible for cooperation with Russia and other CIS countries on DNA databases.

Aliaksandr Ahafonau, also a Colonel of Justice, was appointed head of the Hrodna regional office. The position had been vacant since its former head, Eduard Malinouski, retired in May. Ahafonau previously led the main investigation directorate at the Investigative Committee Central Office. He frequently appeared in state propaganda coverage of high-profile political cases, including those involving persecution of Siarhei Tsikhanouski, persecutions of Kalinouski Regiment volunteers for fighting in Ukraine, and the 2020 arrests of Wagner mercenaries in Minsk.

These staffing changes suggest regular personnel rotation and promotion within the existing law-enforcement establishment. Notably, several appointees have experience in politically sensitive cases. Udovikau's transfer points to close personnel links between the Investigative Committee and the Prosecutor General's Office.

## Increased role of the Security Council and Aliaksandr Valfovich

On 23 July, a series of appointments were made at the KGB; no details, including names, were made public. Instead, Lukashenka announced a stronger coordination role for the State Secretariat of the Security Council and its head, Aliaksandr Valfovich, across the security apparatus, including the KGB. The State Secretariat assumed greater oversight of the KGB's organisational and personnel matters, while sensitive intelligence and operational issues are still to be reported directly to Lukashenka. Analysts linked the decision to Lukashenka's growing trust in Valfovich and his effort to establish more uniform control over security agencies. While the KGB is likely to retain its privileged status, the public nature of the announcement was possibly intended to send a signal to the security elite.

This signal may have been directed particularly at Ivan Tsertsel, who recently took on a visible role in Belarus-US talks while retaining broad powers as the head of the KGB. The Secretariat of the Security Council also weighed in on planned changes to the subordination of the Wildlife Inspectorate, headed by Tsertsel's brother. Planned changes were seen as potentially diminishing the standing of the 'Tsertsel clan' within the system; ultimately, however, they did not receive the backing of the Security Council Secretariat. Similar signals were directed at other security chiefs. On 21 July, Lukashenka publicly reprimanded the Minister of Internal Affairs Ivan Kubrakou over reports of police officers facilitating fuel theft during the harvest campaign. Lukashenka tasked Valfovich with addressing the issue. Taken together, these developments point to Valfovich's growing role as a cross-agency coordinator and overseer. It also fits Lukashenka's long-standing tactic of fostering competition

among security bodies to prevent any ‘siloviki’ faction from consolidating power.

### Reshuffles in the military

Two new Deputy Defence Ministers were appointed. On 8 July, Major-General Uladzimir Bely was promoted to Deputy Defence Minister, having previously headed the Armed Forces’ Main Combat Training Directorate. On 21 July, Major General Aliaksandr Masolau was promoted to Deputy Defense Minister for Logistics. Both of their predecessors, Major-Generals Aliaksandr Naumenka and Andrei Burdyka, were discharged from military service.

These senior appointments are part of broader reshuffle in the defence sector. Major-General Dzmitry Bitny was appointed head of the Armed Forces’ Main Combat Training Directorate to replace Bely. Multiple military officials were relieved of their posts. On 21 July, Major-General Aliaksandr Bas stepped down as commander of the Northwestern Operational Command and retired from military service. On 20 August, Major-General Andrei Matsievich retired from his post as First Deputy Chief of the General Staff. Earlier, on 25 June, Colonel Maksim Hakotsin was promoted to Deputy Chief of the General Staff and Head of the Main Operations Directorate after his predecessor was discharged upon reaching the service age limit.

These appointments appear consistent with the military reshuffle Lukashenka signaled after the large-scale army inspection in early 2026. However, several appointments replaced officials who retired or reached the service age limit, suggesting that the changes also involved a significant element of routine generational rotation.

### New head of Belarus’s Interpol bureau

On 3 July, Aliaksei Vershal was appointed head of the Belarusian Interpol bureau. He was promoted from his position as deputy to former director Dzmitry Miadzvedzeu. Independent reports note that Belarus systematically uses Interpol as a tool of transnational repression by disguising politically motivated cases as ordinary criminal charges. Vershal’s internal promotion suggests continuity in the bureau’s leadership and practices.

## Changes in the government

### New Minister of Architecture

On 23 July, Vadzim Alsheuski was appointed Minister of Architecture and Construction. Alsheuski was promoted from his position as Deputy Chairman of the Brest Region Executive Committee. His predecessor in the role, Aliaksandr Studneu, was replaced after only a year and a half in office, with his future position not yet announced. The change was likely driven by poor performance. There has been a decline in housing construction and, under Studneu, the ministry failed to deliver improvements demanded by the prime minister.

### New Minister of Forestry

On 23 July, Siarhei Uldzinovich was appointed Minister of

Forestry; a promotion from his position as head of the Minsk State Forestry Production Association. His appointment is a routine personnel rotation: former minister Uldzinovich was promoted from within the forestry system after his predecessor, Aliaksandr Kulik held the office for nearly four years.

## Changes in local administration

### Changes among Lukashenka's assistant-inspectors

On 8 July, new assistant-inspectors were appointed for the Homiel and Mahilyou regions, and for Minsk City.

Dzmitry Reucki was appointed Assistant-Inspector for the Minsk City. He had served as a deputy chairman of the KGB since 2020. In his new role, Reucki is tasked with overseeing officials in the Minsk City Executive Committee, including its chair Uladzimir Kukharau, and reporting on cronyism among city officials. His appointment might be part of the wider reshuffle in the KGB, while also strengthening direct oversight of local authorities by a former senior security official. Reucki's predecessor, Yury Fralou, was appointed head of the State Control Committee in the Mahilyou region.

Nadzeja Katkavets was appointed to the same role for the Mahilyou region. A veteran of the Lukashenka regime, Katkavets worked with Lukashenka at the Haradzec state farm before rising to senior government posts after he came to power. She previously served as First Deputy Minister of Agriculture and Deputy Head of the Presidential Property Management Directorate, though has largely remained out of the public eye since leaving government in 2017. Lukashenka extended the public service age limit for the 65-year-old Katkavets, enabling her appointment. Analysts explain this decision by Lukashenka's preference for long-trusted associates and fellow natives of the Shklou district.

Yury Valyavaty was appointed Assistant-Inspector for the Homiel region. The appointment is likely regular rotation, representing a typical career pathway for the Assistant-Inspector position. Valyavaty has a background in agriculture and previously served as First Deputy Chairman of the Hrodna Region Executive Committee.

These appointments highlight Lukashenka's reliance on trusted insiders to oversee local authorities. Reucki's security-service background and Katkavets's long-standing ties to Lukashenka suggest a preference for placing trusted figures in key oversight positions.

### Changes in local executive committees

Reshuffles linked to the appointment of new assistant-inspectors affected two districts in the Mahilyou region. The region has particular symbolic importance within the state system due to its connection to Lukashenka's personal biography, attracting additional attention from the central government.

On 8 July, Mikhail Krytski was appointed head of the Shklou District Executive Committee after holding the same position in

Babruisk District. His replacement in Babruisk, Aliaksandr Kauranin, has been promoted from First Deputy Chairman and Head of Agriculture and Food. The reshuffle came as Lukashenka seeks to turn Shklou, where he spent his childhood, into an 'exemplary' district and a model for the rest of the country. Analysts see this as a continuation of Lukashenka's return to Soviet-style economic management, relying on centralised state control and costly, artificially supported "model" projects that lack economic rationale.

On 23 July, multiple reshuffles affected executive committees in Belarus's western regions. Siarhei Miadzvedzkas, former head of the Astravets District Executive Committee, was promoted to First Deputy Chairman of the Hrodna Region Executive Committee. He filled a vacancy left after Yury Valyavaty was appointed Assistant-Inspector for the Homiel region. New heads of district executive committees were also appointed in Astravets and Shchuchyn.

Aliaksandr Maksimchuk was appointed Deputy Chairman of the Brest Region Executive Committee, overseeing construction, transport, and utilities. He previously headed a public utility management organisation in the Brest region. A new head of the Slonim District Executive Committee was also appointed.

## Diplomatic appointments

On 23 July, new ambassadors were appointed to Tajikistan and Mozambique. Aliaksandr Khudaleeu has been appointed Ambassador to Tajikistan. Since 2018, Khudaleeu served as First Deputy Minister of Emergency Situations. His transfer to a diplomatic post may be linked to the broader personnel reshuffle in the security apparatus. Yury Mikalaichyk, Ambassador to Zimbabwe, was concurrently appointed Ambassador to Mozambique.

### Навіны дзяржаўнага кіравання




## Перастаноўкі ў сілавых структурах і войску

Пасля ранейшых сігналаў аб магчымых перастаноўках у ліпені–жніўні адбылася серыя новых прызначэнняў у сілавых і ваенных структурах. Кадравыя змены закранулі беларускае бюро Інтэрпала, Следчы камітэт, КДБ, Міністэрства абароны і Узброеныя сілы. Нягледзячы на тое,

што гэтыя прызначэнні асвятляюцца незалежнымі і дзяржаўнымі СМІ, інфармацыя ў адкрытых крыніцах застаецца абмежаванай. Праз гэта складана рабіць высновы, ці гэтыя прызначэнні адлюстроўваюць звычайную ратацыю кадраў, намаганні ўмацаваць палітычную лаяльнасць або іншыя меркаванні. Тым не менш, прыкметная канцэнтрацыя прызначэнняў на топавыя пасады адразу ў некалькіх сілавых структурах і войску сведчыць пра больш шырокія перастаноўкі сярод сілавікоў.

## Перастаноўкі ў Следчым камітэце

6 ліпеня Сяргей Удовікаў быў звольнены з пасады начальніка ўпраўлення Следчага камітэта па Мінскай вобласці і неўзабаве атрымаў прызначэнне на пасаду намесніка Генеральнага пракурора. Удовікаў – былы кіраўнік упраўлення Следчага камітэта па Гомельскай вобласці, вядомы тым, што падчас яго кіравання Следчы камітэт адмовіў ва ўзбуджэнні крымінальнай справы па факце смерці затрыманага падчас пратэстаў у 2020 годзе Аляксандра Віхора. Перавод Удовікава на новую пасаду паўтарае шлях Генеральнага пракурора Дзмітрыя Гары, якога таксама перавялі з пасады кіраўніка Следчага камітэта ў снежні 2025 года.

6 жніўня Лукашэнка переставіў кіраўнікоў рэгіянальных упраўленняў Следчага камітэта. Генерал-маёр юстыцыі Уладзімір Шышко быў павышаны з пасады начальніка ўпраўлення Магілёўскай вобласці да начальніка ўпраўлення Мінскай вобласці, замяніўшы на гэтым месцы Сяргея Удовікава. Шышко раней вёў палітычна матываваныя справы супраць Каардынацыйнай рады, справу аб фінансаванні «экстрэмісцкіх фарміраванняў» і дзясяткі крымінальных спраў за каментары ў інтэрнэце пасля забойства Андрэя Зельцара.

Шышко на пасадзе кіраўніка Магілёўскага ўпраўлення СК замяніў палкоўнік юстыцыі Аляксандр Пратасавіцкі. Пратасавіцкі раней працаваў намеснікам кіраўніка ўпраўлення СК па Мінскай вобласці, дзе кіраваў расследаваннямі злачынстваў мінулых гадоў і адказваў за супрацоўніцтва з Расіяй і іншымі краінамі СНД у сферы ДНК-экспертыз.

Палкоўніка юстыцыі Аляксандра Агафонава прызначылі кіраўніком упраўлення СК па Гродзенскай вобласці. Гэтая пасада была вакантнай з траўня, калі былога кіраўніка Эдуарда Маліноўскага адправілі ў адстаўку па ўзросце. Раней Агафонаў узначальваў Галоўнае следчае ўпраўленне цэнтральнага апарату Следчага камітэта. Ён рэгулярна з'яўляўся ў прапагандысцкіх сюжэтах па гучных палітычных справах, у тым ліку па справе Сяргея Ціханоўскага, па справе палка Каліноўскага, а таксама па справе наймітаў Вагнера ў 2020 годзе.

Гэтыя перастаноўкі хутчэй адлюстроўваюць рэгулярную ратацыю кадраў і павышэнні па службе для высокіх пасадоўцаў у Следчым камітэце. Прыкметна, што частка новых прызначэнцаў была задзейнічана ў палітычна матываваных крымінальных справах. Перавод Удовікава таксама сведчыць пра цесныя кадравыя сувязі паміж

Следчым камітэтам і Генеральнай пракуратурай.

## Узмацненне ролі Савета Бяспекі і яго кіраўніка Аляксандра Вальфовіча

23 ліпеня ў КДБ была праведзена серыя кадравых прызначэнняў, аднак імёны прызначаных або іншыя падрабязнасці не былі публічна агучаныя. Замест гэтага Лукашэнка абвясціў аб узмацненні ролі Дзяржаўнага сакратарыята Савета Бяспекі і яго кіраўніка Аляксандра Вальфовіча ў каардынаванні дзейнасці сілавога апарату, у тым ліку КДБ. Дзяржсакратарыят атрымаў больш шырокія паўнамоцтвы па наглядзе за арганізацыйнымі і кадравымі пытаннямі КДБ, але адчувальныя пытанні, звязаныя з разведкай і аператыўнай дзейнасцю, па-ранейшаму дакладваюцца непасрэдна Лукашэнку. Аналітыкі звязалі гэтае рашэнне з ростам даверу Лукашэнкі да Вальфовіча і яго імкненнем уніфікаваць кантроль над сілавымі ведамствамі. Хоць КДБ, верагодна, захавае свой прывілеяваны статус, публічнае абвяшчэнне аб узмацненні ролі Сакратарыята Савета Бяспекі і асабіста Вальфовіча можна інтэрпрэтаваць як сігнал для сілавікоў.

Гэты сігнал скіраваны ў першую чаргу Івану Церцелю, які ўзяў на сябе прыкметную ролю ў беларуска-амерыканскіх кантактах у дадатак да шырокіх паўнамоцтваў кіраўніка КДБ. Выглядае, што Сакратарыят Савета Бяспекі паўплываў на прыняцце рашэння па запланаваных зменах у падпарадкаванні Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету, якую ўзначальвае брат Церцеля. Раней аналітыкі разглядалі гэта як патэнцыйнае аслабленне пазіцыі «клана Церцеляў» унутры сістэмы, аднак Сакратарыят Савета Бяспекі па выніку не падтрымаў меркаваныя змены. Падобныя сігналы былі скіраваныя і іншым сілавікам на топавых пасадах. 21 ліпеня міністр унутраных спраў Іван Кубракоў атрымаў публічную вымову ад Лукашэнкі праз тое, што супрацоўнікі міліцыі нібыта садзейнічалі крадзяжу паліва падчас уборачнай кампаніі. Лукашэнка даручыў Вальфовічу разабрацца з гэтым пытаннем. Агулам, гэтыя падзеі сведчаць пра ўзмацненне ролі Вальфовіча як кантралёра і каардынатара сярод сілавых ведамстваў. Гэта таксама ўпісваецца ў тактыку Лукашэнкі па заахвочванні канкурэнцыі паміж сілавымі структурамі, каб не дапусціць кансалідацыі ўплыву груповак сілавікоў.

## Перастаноўкі ва Узброеных Сілах

У ліпені былі прызначаныя два новыя намеснікі міністра абароны. 8 ліпеня генерал-маёр Уладзімір Белы пайшоў на павышэнне з пасады кіраўніка Галоўнага ўпраўлення баявой падрыхтоўкі Узброеных Сіл. 21 ліпеня генерал-маёр Аляксандр Масолаў быў павышаны да пасады намесніка міністра абароны па тыле. Абодва іх папярэднікі, генерал-маёры Аляксандр Навуменка і Андрэй Бурдыка, былі звольненыя з вайсковай службы ў запас.

Гэтыя змены з’яўляюцца часткай больш шырокіх кадравых перастановак у войску. Генерал-маёр Дзмітрый Бітны быў прызначаны начальнікам Галоўнага ўпраўлення баявой

падрыхтоўкі Узброеных Сіл замест Уладзіміра Белага. Некалькі вайсковых чыноўнікаў былі вызваленыя ад сваіх пасад па ўзросце. 21 ліпеня генерал-маёр Аляксандр Бас пакінуў пасаду камандуючага войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання. 20 жніўня генерал-маёр Андрэй Мацієвіч быў вызвалены з пасады першага намесніка начальніка Генеральнага штаба. Раней, 25 чэрвеня, палкоўнік Максім Гакоцін быў павышаны да пасады намесніка начальніка Генеральнага штаба – начальніка Галоўнага аператыўнага ўпраўлення пасля таго, як яго папярэднік быў звольнены па ўзросце.

Гэтыя прызначэнні могуць быць звязаныя з кадравымі перастаноўкамі, пра якія Лукашэнка сігналізаваў пасля маштабнай праверкі войска ў пачатку 2026 года. Аднак у большасці выпадкаў новыя прызначэнні замяняюць вайсковых чыноўнікаў, якія пайшлі  ў адстаўку па ўзросце або дасягнулі гранічнага ўзросту знаходжання на службе. Гэта сведчыць пра тое, што змены ў значнай ступені адлюстроўваюць звычайную ратацыю пакаленняў.

### Новы кіраўнік беларускага бюро Інтэрпала

3 ліпеня Аляксей Вершаль быў прызначаны кіраўніком Нацыянальнага цэнтральнага бюро Інтэрпала ў Беларусі. Яго павысілі з пасады намесніка былога кіраўніка Дзмітрыя Мядзведзева. Незалежныя справаздачы адзначаюць, што Беларусь сістэматычна выкарыстоўвае механізмы Інтэрпала як інструмент транснацыянальных рэпрэсій, маскіруючы палітычна матываваныя справы пад звычайныя крымінальныя абвінавачанні. Унутранае павышэнне Вершаля сведчыць пра пераемнасць у кіраўніцтве і практыках бюро.

## Змены ва ўрадзе

### Новы міністр архітэктуры

23 ліпеня Вадзім Альшэўскі быў прызначаны міністрам архітэктуры і будаўніцтва. Альшэўскага павысілі з пасады намесніка старшыні Брэсцкага аблвыканкама. Былога міністра архітэктуры Аляксандра Студнева замянілі ўсяго праз паўтара года на пасадзе, пры гэтым пра яго новую пасаду нічога не вядома. Верагодна, міністра замянілі праз незадаволенасць вынікамі яго працы. Замена Студнева адбылася на фоне зніжэння ўводу ў эксплуатацыю аб’ёмаў жылля і нядольнасці міністэрства забяспечыць патрэбныя паказчыкі, якіх патрабаваў прэм’ер.

### Новы міністр лясной гаспадаркі

23 ліпеня Сяргей Ульдзіновіч быў прызначаны міністрам лясной гаспадаркі. Яго павысілі з пасады дырэктара Мінскага дзяржаўнага вытворчага лесагаспадарчага аб’яднання. Гэтае прызначэнне хутчэй адлюстроўвае звычайную ратацыю: новага міністра павысілі ўнутры сістэмы лясной гаспадаркі пасля таго, як яго папярэднік Аляксандр Кулік займаў пасаду амаль 4 гады.

## Змены ў мясцовай адміністрацыі

## Новыя памочнікі-інспектары Лукашэнкі

8 ліпеня новыя памочнікі-інспектары былі прызначаныя ў Гомельскую і Магілёўскую вобласці, а таксама ў Мінск.

Дзмітрый Равуцкі быў прызначаны памочнікам-інспектарам па Мінску. З 2020 года ён займаў пасаду намесніка старшыні КДБ. Равуцкаму даручылі наглядаць за чыноўнікамі Мінгарвыканкама, у тым ліку за яго кіраўніком Уладзімірам Кухаравым, каб прадухіляць кумаўство сярод гарадскіх чыноўнікаў. Яго прызначэнне можа быць звязана кадравымі перастаноўкамі ў КДБ, і адначасова ўзмацняе нагляд за мясцовымі ўладамі, дзе Равуцкі зможа выкарыстоўваць досвед працы на высокіх пасадах у сілавых структурах. Папярэдніка Равуцкага, Юрыя Фралова, прызначылі кіраўніком Камітэта дзяржаўнага кантролю Магілёўскай вобласці.

Надзею Каткавец вярнулі на дзяржслужбу памочніцай-іспектаркай па Магілёўскай вобласці. Ветэран сістэмы, Каткавец працавала разам з Лукашэнкам яшчэ ў саўгасе «Гарадзец», а пасля яго прыходу да ўлады пачала займаць высокія дзяржаўныя пасады. Яна займала пасады першай намесніцы міністра сельскай гаспадаркі і намесніцы Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта, але збольшага заставалася па-за ўвагай грамадскасці пасля сыходу з дзяржслужбы ў 2017 годзе. Адмыслова для 65-гадовай чыноўніцы Лукашэнка падоўжыў гранічны ўзрост знаходжання на дзяржаўнай службе, што зрабіла магчымым яе прызначэнне. Аналітыкі тлумачаць вяртанне Каткавец на высокую пасаду тым, што Лукашэнка аддае перавагу даўно праверaны лаяльным паплечнікам і землякам са Шклоўшчыны.

Юрый Валяваты быў прызначаны памочнікам-інспектарам па Гомельскай вобласці. Гэтае прызначэнне, верагодна, з’яўляецца звычайнай кадравай ратацыяй і адлюстроўвае тыповую кар’ерную траекторыю для пасады памочніка-інспектара. Валяваты мае досвед працы ў сельскай гаспадарцы і раней займаў пасаду першага намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкама.

Гэтыя прызначэнні падкрэсліваюць стаўку Лукашэнкі на правераных людзей унутры сістэмы для нагляду за мясцовымі ўладамі. Досвед Равуцкага ў сілавых структурах і даўнія сувязі Каткавец з Лукашэнкам сведчаць пра перавагу прызначэнняў давераных асоб на ключавыя кантралёрскія пасады.

## Змены ў мясцовых выканкамах

Кадравыя перастаноўкі, звязаныя з прызначэннем новых памочнікаў-інспектараў, закранулі два раёны Магілёўскай вобласці. Гэтая вобласць мае асаблівае сімвалічнае значэнне ў дзяржаўнай сістэме праз яе сувязь з асабістай біяграфіяй Лукашэнкі.

8 ліпеня Міхаіл Крыцкі быў прызначаны старшынёй Шклоўскага райвыканкама. Яго перавялі з аналагічнай пасады ў Бабруйскім раёне. У Бабруйску яго замяніў Аляксандр Каўранін, якога павысілі з пасады першага

намесніка старшыні камітэта – начальніка ўпраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні. Лукашэнка імкнецца ператварыць Шклоўскі раён, дзе ён правёў сваё дзяцінства, ва «ўзорны» раён і мадэль для ўсёй краіны. Аналітыкі разглядаюць гэта як працяг Лукашэнкам савецкага стылю кіравання эканомікай, заснаванага на цэнтралізаваным дзяржаўным кантролі і дарагіх, штучна падтрымліваемых «узорных» праектах, якія не маюць эканамічнага абгрунтавання.

23 ліпеня кадравыя перастаноўкі закранулі выканкамы ў заходніх рэгіёнах Беларусі. Сяргей Мядзвецкас, былы старшыня Астравецкага райвыканкама, быў павышаны да пасады першага намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкама. Ён заняў пасаду, якая вызвалілася пасля прызначэння Юрыя Валяватага памочнікам-інспектарам па Гомельскай вобласці. Новыя старшыні райвыканкамаў былі таксама прызначаныя ў Астравецкім і Шчучынскім раёнах.

Аляксандр Максімчук быў прызначаны намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкама, адказным за будаўніцтва, транспарт і ЖКГ. Раней ён узначальваў арганізацыю па кіраванні ЖКГ у Брэсцкай вобласці. Таксама быў прызначаны новы старшыня Слонімскага раённага выканаўчага камітэта.

## Прызначэнні дыпламатаў

23 ліпеня прызначылі новых паслоў у Таджыкістан і Мазамбік. Аляксандр Худалееў быў прызначаны паслом у Таджыкістане. З 2018 года Худалееў займаў пасаду першага намесніка міністра па надзвычайных сітуацыях. Яго перавод на дыпламатычную пасаду можа быць звязаны з кадравымі перастаноўкамі ў сілавым апараце. Юрый Мікалайчык, пасол у Зімбабвэ, быў адначасова прызначаны паслом у Мазамбіку.